# ЧАСОПІС «БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА» ЯК СІМБІЁЗ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА І НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНАГА ВЫДАННЯ: ДА ПЫТАННЯ ВЫЗНАЧЭННЯ ТЫПАЛАГІЧНАГА СТАТУСУ

***Т. У. Падаляк***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*tatsiana_pd@mail.ru*

Адзін з самых аўтарытэтных часопісаў краіны «Беларуская думка» ў 2022 г. адзначыў 100-гадовы юбілей. У артыкуле разглядаецца гістарычная рэтраспекцыя, аналізуецца сучасны стан выдання. Фіксуецца парытэт грамадска-палітычных і навуковых публікацый. Абгрунтоўваецца актуальнасць удакладнення тыпалагічнага статусу часопіса: грамадска-палітычны і навукова-тэарэтычны.

***Ключавыя словы***: сродкі масавай інфармацыі; часопіс «Беларуская думка»; навуковая журналістыка; навукова-папулярныя выданні; Вышэйшая атэстацыйная камісія.

# «BELARUSIAN DUMKA» AS A SYMBIOSIS OF SOCIO-POLITICAL AND SCIENTIFIC-POPULAR MAGAZINE: THE ISSUE OF DEFINING THE TYPOLOGICAL STATUS

***T. U. Padaliak***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: T. U. Padaliak (tatsiana_pd@mail.ru)*

In 2022, one of the most authoritative magazines of the country, «Belarusian Dumka», celebrated its 100th anniversary. The article examines the historical retrospection, analyzes the current state of the magazine. The parity of socio-political and scientific publications is fixed. The urgency of clarifying the typological status of the magazine is substantiated: social-political and scientific-theoretical

***Key words***: mass media; «Belarusian Dumka» magazine; scientific journalism; popular scientific editions; Higher Certification Commission.

Адзін з самых аўтарытэтных і ўплывовых часопісаў краіны «Беларуская думка» ў 2022 г. адзначыў 100-гадовы юбілей. На працягу векавога шляху часопіс некалькі разоў змяняў і назву, і статус, і мову выдання. Пры гэтым у розныя перыяды сваёй гісторыі часопіс крочыў «у рытме эпохі», «заўсёды быў у авангардзе грамадска-палітычнай і навуковай думкі» – выснова, якую аргументавана і доказна зрабіла аглядальнік С. Міхайлоўская, вывучыўшы выпускі часопісаў «Вперёд», «Бальшавік Беларусі», «Коммунист Белоруссии», «Беларуская думка» [1, с. 14]. З часопісам актыўна супрацоўнічалі вядомыя палітычныя і грамадскія дзеячы, вядучыя вучоныя і творцы. Напрыклад, у навуковым багажы доктара філалагічных навук, прафесара Барыса Васільевіча Стральцова, у гонар якога праводзіцца Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Журналістыка – Медыялогія – Настаўніцтва», – больш за дзесяць артыкулаў на старонках «Коммуниста Белоруссии» і «Беларускай думкі».

Гісторыя часопіса цікавая і разнастайная. 6 мая 1922 года Прэзідыум ЦК КП(б)Б прыняў пастанову аб стварэнні ў Мінску тэарэтычнага і палітычнага часопіса «Вперёд». Першачарговай мэтай выдання была неабходнасць азнаямлення грамадскасці з пытаннямі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, функцыянавання сістэмы вышэйшай адукацыі, ідэалогіі, культуры. Ставілася задача ўсебакова, аб’ектыўна і прафесійна асвятляць палітыку дзяржавы, работу органаў выканаўчай і заканадаўчай улады, дасягненні айчыннай і замежнай навукі. Часопіс быў закліканы адказваць на актуальныя запыты чытачоў, аналізаваць надзённыя пытанні і праблемы. Першыя 11 нумароў выйшлі на рускай мове. Са студзеня 1927 г. часопіс стаў беларускамоўным, змяніў назву на «Весткі ЦК КП(б)Б», з сакавіка таго ж года выходзіў як «Бальшавік Беларусі». На старонках часопіса публікаваліся тэарэтычныя артыкулы, вёўся плённы абмен вопытам, асвятляліся пытанні эканомікі, культуры, адукацыі, друкавалася крытыка і бібліяграфія. У час Вялікай Айчыннай вайны часопіс не выдаваўся. Аднавіў працу ў красавіку 1945 г. Са студзеня 1949 г. вярнуўся на рускую мову выдання.

З 1952 па 1990 гг. часопіс выходзіў пад назвай «Коммунист Белоруссии». На розных этапах яго ўзначальвалі вядомыя дзеячы дзяржавы: «Рэдактары ўваходзілі ў склад Цэнтральнага Камітэта партыі, абіраліся дэпутатамі Вярхоўнага Савета БССР. Будучы адным з галоўных друкаваных органаў ЦК КПБ, выданне заставалася трыбунай перадавой думкі» [1, с. 16]. У раздзеле «Новыя навуковыя даследаванні» публікаваліся тэарэтычныя артыкулы, фрагменты з кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый навуковых работнікаў рэспублікі. Рэцэнзаваліся кнігі і брашу-

ры на грамадска-палітычныя тэмы, друкаваліся літаратуразнаўчыя і мастацтвазнаўчыя артыкулы, агляды перыёдыкі.

Аналізуючы канцэптуальна-зместавыя і жанрава-функцыянальныя асаблівасці выдання ў артыкуле «Часопіс “Коммунист Белоруссии”: ад адлігі да перабудовы», даследчык А. Самовіч адзначае, што ў перыяд татальнага партыйнага кантролю і панавання каманднаадміністратыўнай сістэмы работа рэдакцыі жорстка рэгламентавалася. Па многіх праблемных пытаннях жыцця савецкай дзяржавы і грамадства інфармацыя была закрытай і магла транслявавацца журналістамі толькі пасля дазволу «зверху»: у гэтых умовах для часопіса «былі характэрныя афіцыёзнасць, штамп, лозунгавы стыль, прыхарошванне савецкай рэчаіснасці» [2, с. 20]. Аўтар слушна падкрэслівае, што з другой паловы 1980-х гг. часопіс вылучаўся глыбінёй пранікнення ў сутнасць падзей, праблем і з’яў грамадска-палітычнага жыцця рэспублікі, у публікацыях уважліва аналізаваліся працэсы, якія адбываліся ў краіне. На фоне карэннага абнаўлення ўсіх бакоў жыцця, трансфармацыі грамадскіх настрояў «усё больш відавочнай станавілася неабходнасць змены назвы… Сярод прапаноў адносна новага імя выдання былі наступныя: “Согласие”, “Честное слово”, “Рада”, “Мысль”, “Альтернатива”» [2, с. 26]. У 1991 г. часопіс выйшаў пад назвай «Беларуская думка».

Пачатак 1990-х гг. для часопіса, як і для ўсёй краіны, быў дастаткова турбулентным. У кастрычніку 1991 г. ён быў зарэгістраваны як выданне навукова-даследчага інстытута (НДІ) Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь. Аднак тэматыка публікацый значна выходзіла за межы ведамаснага часопіса, таму ў хуткім часе ён стаў органам Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. 9 лістапада 1995 г. выйшла распараджэнне Кіраўніка дзяржавы, згодна з якім заснавальнікам часопіса стала Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. З гэтага часу «Беларуская думка» ўсё больш упэўнена імкнулася да «самаідэнтыфікацыі», набывала аблічча акадэмічнага часопіса. З 2007 г. яго выдаўцом з’яўляецца УП «БелТА».

Часопіс «Беларуская думка» мае двайное падпарадкаванне: грамадскапалітычны і навукова-папулярны. Рэдакцыяй захоўваецца парытэт грамадска-палітычных і навуковых публікацый. Першая частка часопіса – грамадска-палітычны кантэнт: папулярныя рубрыкі «Патрыятызм. Адзінства. Радзіма», «Дзяржаўны інтарэс», «Актуальнае інтэрв’ю», «Дыскусійная пляцоўка», «Тэма», «Традыцыі», «Кніжная паліца» і інш. Другі раздзел «Навука. Даследаванні. Распрацоўкі» прадстаўляе навуковыя публікацыі.

У рубрыцы «Актуальнае інтэрв’ю» звычайна закранаюцца надзённыя тэмы і праблемы. Напрыклад, адным з гасцей часопіса быў старшыня

Вышэйшай атэстацыйнай камісіі (ВАК) Рэспублікі Беларусь, доктар юрыдычных навук Аляксандр Гучок. У інтэрв'ю «Навуковая праца не павінна вымярацца аб'ёмам напісанага» аналізаваліся новая рэдакцыя Палажэння аб Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, а таксама Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў. Літаральна пакрокава разглядаліся змены ў рабоце ВАК як незалежнага атэстацыйнага органа пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, пазначаліся навацыі для саіскальнікаў і г. д. Тлумачылася, што дзеючае да 1 верасня 2022 г. Палажэнне аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў было распрацавана ў 2004 г, з гэтага часу адбылося нямала змен і ў грамадстве, і ў навуцы, таму з'явілася «неабходнасць актуалізаваць нацыянальную практыку навуковай атэстацыі» [3, с. 16]. А. Гучок адзначыў, што адкрытасць атэстацыйнага працэсу будзе садзейнічаць большай адказнасці і прафесіяналізму: «Навуковая садружнасць была салідарнай у імкненні забяспечыць адкрытасць. Дзеля гэтага ўводзіцца патрабаванне аб размяшчэнні асноўных матэрыялаў пры разглядзе навуковай працы – аўтарэферата дысертацыі, водзываў навуковага кіраўніка або кансультанта, афіцыйных апанентаў, апаніруючай арганізацыі і іншых водгукаў аб дысертацыі – на сайце ўстановы адукацыі або навуковай арганізацыі, пры якой працуе савет па абароне дысертацый. Поўная адкрытасць! Навуковая садружнасць зможа самастойна вызначыць, наколькі глыбока прапрацавана дысертацыя, якую ацэнку спецыялісты далі навуковай працы» [3, с. 16]. Старшыня ВАК Беларусі звярнуў асаблівую ўвагу на важнасць пераемнасці пакаленняў: «Намаганні па ўдасканаленні нацыянальнай практыкі навуковай атэстацыі скіраваны, перш за ўсё, на прыцягненне моладзі ў навуку. Пры гэтым нашай безумоўнай каштоўнаснай устаноўкай у дзейнасці з'яўляецца павага склаўшыхся ў нашай краіне акадэмічных і навуковых традыцый» [3, с. 20].

Часопіс «Беларуская думка» выходзіць на беларускай, рускай і англійскай (пры афармленні навуковых прац) мовах. Ён з'яўляецца навуковым выданнем, рэкамендаваным ВАК для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных, палітычных, сацыялагічных, філалагічных, філасофскіх, эканамічных навуках. Усе публікацыі афармляюцца згодна з афіцыйнымі агульнапрынятымі навуковымі стандартамі. У часопісе друкуюцца патрабаванні да навуковых матэрыялаў, якія паступаюць у рэдакцыю: абавязкова павінны быць адлюстраваны ступень і глыбіня прапрацоўкі тэмы з указаннем існуючых падыходаў айчынных і замежных вучоных па ўзнятых пытаннях; разам з артыкулам прадстаўляецца знешняя рэцэнзія

спецыяліста (доктара або кандыдата навук) у адпаведнай галіне; для аспірантаў (магістрантаў) – выпіска з пратакола пасяджэння кафедры (іншай структуры) аб рэкамендацыі артыкула да друку. Аўтар павінен гарантаваць правільнасць усіх звестак, адсутнасць плагіяту і іншых форм неправамернага запазычання і г. д. [4, с. 104]. Усе навуковыя публікацыі ў «Беларускай думцы» ўтрымліваць індэкс УДК (універсальнай дзесяцічнай класіфікацыі), анатацыю на беларускай (рускай) і англійскай мовах, прыдатную для размяшчэння ў навукаметрычных базах дадзеных, іншыя навуковыя характарыстыкі.

У сувязі з гэтым непазбежна ўзнікае пытанне адносна тыпалагічнага статусу часопіса: навукова-папулярны – ці навуковы (навукова-тэарэтычны)?

Даследчыкі канстатуюць, што з развалам СССР назіраўся крызіс навуковай і навукова-папулярнай журналістыкі. Аднак у 2000-х гадах увага да папулярызацыі навукі значна ўзрасла ва ўсіх постсавецкіх краінах. У апошні час з’явілася нямала прац, у якіх асэнсоўваюцца традыцыі і навацыі ў сферы папулярызацыі дасягненняў навукі і тэхнікі ў медыяпрасторы, асаблівасці метадалогіі стварэння навукова-папулярнага кантэнту ў СМІ, удакладняецца тыпалогія сучасных навуковых і навукова-папулярных выданняў, аналізуюцца спецыфіка і магчымасці іх работы ў інтэрнэце (пры гэтым некаторыя даследчыкі з упэўненасцю сцвярджаюць, што «будучыня навукова-папулярных рэсурсаў непарыўна звязана з новымі медыя» [5, с. 143]), разглядаюцца перспектывы развіцця навукова-папулярных блогаў і г. д. Абмяркоўваецца таксама праблема манетызацыі кантэнту навуковых і навукова-папулярных выданняў у інтэрнэце – хоць, на наш погляд, да гэтага пытання варта ставіцца са стрыманым аптымізмам, паколькі ўказаныя СМІ з’яўляюцца ў асноўным вузка спецыялізаванымі, не разлічанымі на шырокую аўдыторыю.

Грунтоўна і скрупулёзна тэарэтыкамі СМІ прэпаруюцца актуальныя дэфініцыі: навуковая журналістыка і навукова-папулярная журналістыка. Так, С. Суворава ў артыкуле «Журналістыка навуковая і навукова-папулярная: асаблівасці прадметнай галіны, функцый, задач» канстатуе, што ўказаныя паняцці часцей за ўсё ўжываюцца як сінанімічныя, узаемазаменныя і служаць для абазначэння таго сегмента інфармацыйнай прасторы, у якім атрымлівае адлюстраванне жыццё навукі. Аднак, па меркаванні даследчыка, гэта не зусім заканамерна, паколькі «да стварэння дадзенага сегмента датычныя віды інфармацыйнай вытворчасці, выкліканыя да жыцця рознымі грамадскімі запатрабаваннямі, якія выконваюць у жыцці грамадства розныя функцыі. У іх – розныя суб’екты, яны істотна адрозніваюцца адзін ад аднаго па мэтах і метадах дзейнасці,

па характарыстыках тых прадуктаў, якія ствараюць. Бясспрэчна, паміж імі існуе ўзаемасувязь, узаемаабумоўленасць і ўзаемазалежнасць. Але яны не ідэнтычныя, і гэта неабходна ўсведамляць» [6, с. 14].

Аналізуемыя феномены маюць аб'ектыўныя адрозненні, якія вызначаюцца living рознымі «функцыянальнымі абавязкамі» гэтых відаў дзейнасці, рознымі задачамі пры стварэнні матэрыялаў і падыходамі да прадметнай галіны, што ў іх адлюстроўваецца, а таксама моўнымі асаблівасцямі тэкстаў, падкрэслівае С. Суворава: «Навуковыя публікацыі, разлічаныя на аўдыторыю навуковай супольнасці, забяспечваюць развіццё навукі як сацыяльнага інстытута і з'яўляюцца творамі навукі, а не журналістыкі» [6, с 22–23], тады як «навукова-папулярныя матэрыялы прызначаны для масавай аўдыторыі, выкладаюцца на агульнадаступнай мове. Яны скіраваныя на рэалізацыю асветніцкай функцыі журналістыкі, забяспечваюць аптымальны стан масавай свядомасці, што ў сваю чаргу спрыяе самарэгуляцыі грамадства як сістэмы» [6, с. 23].

На падставе выяўленых дэфінітыўных адрозненняў робіцца слушная выснова, што навуковая журналістыка ўяўляе сабой разнавіднасць спецыяльных навуковых камунікацый, а навукова-папулярная журналістыка з'яўляецца разнавіднасцю журналісцкай творчасці.

Такім чынам, на парадак дня паўстае пытанне аб удакладненні статуса часопіса «Беларуская думка»: грамадска-палітычны і навукова-папулярны або: грамадска-палітычны і навуковы (навукова-тэарэтычны). Гэта – яшчэ раз звернем увагу – абумоўлена тым, што на парытэтных асновах у выданні змяшчаюцца грамадска-палітычныя (публіцыстычныя) матэрыялы і навуковыя, якія з'яўляюцца часткай навуковых камунікацый сучаснай гуманітарыстыкі: гісторыя, палітыка, сацыялогія, філалогія, філасофія, эканоміка.

Па меркаванні галоўнага рэдактара часопіса «Беларуская думка» І. Ганчарука, пытанне ўдакладнення статусу выдання з'яўляецца актуальным, яно абмяркоўваецца ў акадэмічных колах, сярод членаў навукова-рэдакцыйнага савета часопіса, у склад якога ўваходзяць вядучыя навукоўцы краіны – аўтарытэтныя дактары навук, члены-карэспандэнты і акадэмікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Карэкціроўка, канкрэтызацыя, удакладненне – працэс дыялектычны, які адпавядае данаміцы развіцця школы айчыннай навуковай журналістыкі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Михайловская С.* В ритме эпохи // Беларус. думка. 2022. № 4. С. 14–23.
2. *Самович А.* Журнал «Коммунист Белоруссии»: от оттепели к перестройке // Беларус. думка. 2017. № 5. С. 20–26.

3. *Гончарук И. С., Гучок А. Е.* Александр Гучок: «Научная работа не должна измеряться объемом написанного»: [интервью с А. Е. Гучком] // Беларус. думка. 2022. № 7. С. 16–20.
4. Требования к публикациям в журнале «Беларуская думка» // Беларус. думка. 2022. № 11. С. 104.
5. *Жохов С. Б.* Научно-популярные издания в среде новых медиа // Знак: проблемное поле медиаобразования. 2020. № 4 (38). С. 142–150.
6. *Суворова С. П.* Журналистика научная и научно-популярная: особенности предметной области, функций, задач // Вестник Москов. ун-та. Сер. 10. Журналистика. 2009. № 6. С. 14–23.